ствования женских сайтов вообще. Об этом свидетельствует большой процент затруднившихся ответить (20,0 %), т. е. они не только не интересуются содержанием сайтов, но даже никогда не пытались понять, что это такое посетить их.

**Васіль Вараб'ёў**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

## ПРАФЕСІЙНЫ МЕНТАЛІТЭТ ЖУРНАЛІСТА

1. Надоечы папулярнае выданне выйшла з аншлагавым загалоўкам «Герой нашага часу» і стрыманым падзагалоўкам з пытальнікам «Сціпласць і талент не выклікаюць вялікай павагі?» («АИФ» в Белоруссии, 2008, № 40). Публікацыя адлюстроўвае зандаж грамадскай думкі, праведзены сацыялагічным цэнтрам «Зеркало-Инфо». На пытанне ў выглядзе анкеты-інтэрв'ю «Якія з наступных характарыстык больш за ўсё адпавядаюць вашым уяўленням пра паважанага і годнага чалавека нашых дзён?» адказвалі каля паўтары тысячы жыхароў Беларусі. Прапарцыянальна-квотная выбарка, кантралюемыя прыкметы забяспечылі памылку рэпрэзентатыўнасці не болей за 2 працэнты.

У выніку толькі палавіна апытаных (54 %) указалі, што паважаны і годны – гэта чалавек, які жыве «сумленна, а не дзеля выгады і задавальненняў». Другую пазіцыю ў іерархіі каштоўнасцей займае «добры сем'янін» (52 %). **Толькі трэцяразрадным аказаўся «прафесіянал»** (44 %). Талерантнасць (34 %), адукаванасць (27 %), спагадлівасць і душэўнасць (26 %), законапаслухмянасць (23 %) адціснуты ў грамадскай думцы на перыферыю прыярытэтаў грамадзяніна (4–7 пазіцыі). Зусім выцвітаюць, на думку рэспандэнтаў, такія якасці высакароднага чалавека, як ідэйная перакананасць, здольнасць адстойваць грамадзянскія пазіцыі (17 %), вера ў Бога (14 %), а таксама патрыятызм, здольнасць ставіць інтарэсы Радзімы «вышэй за асабістыя» (13 %).

Сацыёлагі зарэгістравалі тэндэнцыю ў лічбах і дыяграмах, паставілі дыягназ. Журналісты публічна прэзентавалі «хваравіты эпікрыз» свайму чытачу з інтанацыяй адабральна-ўнушальнага характару. Пры гэтым калегі нават не ўспомнілі пра прафесійную каштоўнасць (папярэджаннеаксіёма), што трансляцыя рэгрэсіўнай тэндэнцыі можа мець «кумулятыўны эфект». Значыцца, прафесійны менталітэт журналіста даў чарговы збой.

2. Вераснёўская стажыроўка і заняткі на курсах павышэння кваліфікацыі раённых журналістаў дапамаглі ажыццявіць экспертнае апытанне наконт стратэгіі рэдакцыйнага менеджменту і тэматычных прыярытэтаў рэгіянальных СМІ. Па выказваннях калег, на рэдакцыйных планёрках і лятучках найперш плануецца, абмяркоўваецца і «прэвалюе рэдактарскі попыт на матэрыялы сельскагаспадарчых сезонных змаганняў», «паведамленні пра штабныя пасяджэнні і інфармацыйныя паездкі заснавальнікаў ганарарна забяспечваюцца лепш…» [гл. 2].

Традыцыйным нажніцам паміж чытачоўскім інтарэсам, запатрабаванасцю і журналісцкай прапановай прысвечана безліч навуковых дыскусій. Аднак ні метадычныя высілкі навукоўцаў, ні метадалагічны прысуд чытачоў у выглядзе хранічнага зніжэння падпіскі не кранаюць «стабільную кульгавасць» прафесійнага менталітэту журналіста. Як вядома ад фізіёлагаў, хранічная кульгавасць спараджае комплексы апатыі, ці агрэсіі, ці беспакаранасці, ці гнюснасці. Амбіцыйнасць «кульгавай качкі» ў прафесійным абліччы ў свой час публіцыстычна бездакорна прааналізаваў Мелор Стуруа.

3. Вытворная комплексу адзначаных ментальных хібаў знаходзіць пацвярджэнне ў наступным факце. Выданні «Образование и право», «Адкрыты ўрок», «Республиканская Олимпиада-2007» і інш., якія рэдагаваў калектыў «Настаўніцкай газеты», выкарыстаны некаторымі журналістамі і «нявызначанымі асобамі» для пералічэння 447 млн. рублёў на падкантрольныя прыватныя рахункі (гл. Белгазета, 2008, 20 октября). Гэтая з'ява, зарэгістраваная ў 129-томавай крымінальнай справе, дае вычарпальны адкрыты ўрок неабходнасці тэрміновай парадыгмальнай распрацоўкі праблемы прафесійнага менталітэту журналіста.

4. Катэгорыя «прафесійны менталітэт журналіста» адлюстроўвае цэласнасць чалавечага фактара ў сацыяльна-палітычнай і сацыяльна-прававой сістэме журналістыкі, акрэслівае прадмет яе вывучэння і навуковага забеспячэння ў паліталагічным аспекце. У адрозненне ад тэрміна «прафесійная свядомасць», які вызначае прадмет вывучэння журналісцкай дзейнасці толькі ў філолага-псіхалагічным ракурсе [гл. 1], катэгорыя «прафесійны менталітэт журналіста» інтэгруе ў сабе як адзначаны аспект, так і прававыя, паліталагічныя канстанты.

Структура прафесійнага менталітэту журналіста ўяўляе сабой сістэму ўзаемадзеянняў розных узроўняў: **канцэптуальнага, тэхналагічнага, рэфлексійнага, камунікатыўнага, інфармацыйнага.**

На **канцэптуальным** узроўні праз фарміраванне прафесійных каштоўнасцей журналіста забяспечваецца яго ідэнтыфікацыя з менталітэтам

беларускага грамадства, яго дзяржаўнасцю і культурай. Прафесійныя каштоўнасці журналіста замацоўваюцца з дапамогай мэтанакіраванай адукацыі і выхавання комплексу ўяўленняў пра мэты, змест, формы і сродкі творчай грамадска-палітычнай дзейнасці, якая абумоўліваецца не толькі яе сацыяльна-прававой нарміроўкай, але і навукова-метадычным, матэрыяльна-інфармацыйным забеспячэннем.

На **тэхналагічным** узроўні праз фарміраванне сістэмы прафесійных спосабаў ажыццяўлення творчай грамадска-палітычнай дзейнасці забяспечваецца паслядоўная рэалізацыя канкрэтных крокаў па дасягненні яе мэт, прынятых рашэнняў заснавальнікамі СМІ і рэдакцыйным менеджментам.

На **рэфлексійным** узроўні праз фарміраванне сістэмы прафесійных аналітычных, крытычных, прагнастычных, арганізацыйных працэдур ажыццяўляецца цэласнае асэнсаванне, кантраляванне, рэгуляцыя і самаўдасканаленне творчай грамадска-палітычнай дзейнасці для аптымізацыі працэсу яе выканання і інтэрпрэтацыі атрыманых вынікаў.

На **камунікатыўным** узроўні праз фарміраванне сістэмы прафесійных камунікацый забяспечваецца прэзентацыя вынікаў творчай грамадска-палітычнай дзейнасці чытачам, гледачам, слухачам – спажыўцам СМІ.

На **інфармацыйным** узроўні з дапамогай створанай сістэмы прафесійнай дакументацыі і тэхнічных сродкаў забяспечваецца фіксацыя, абгрунтаванне і трансляцыя інфармацыі аб плённасці і значнасці вынікаў журналісцкай дзейнасці.

Сістэмаўтваральным фактарам узаемадзеяння пералічаных узроўняў, які аб’ядноўвае структуру прафесійнага менталітэту журналіста, выступае яго дамінуючы – рэфлексійны – узровень. Ён забяспечвае ўзаемасувязь усіх астатніх, іх інтэграцыю ў аптымальна функцыянуючы асяродак розных аспектаў чалавечага фактара журналісцкай дзейнасці як сацыяльна-прававога і сацыяльна-палітычнага інстытута. Прафесійны менталітэт журналіста адлюстроўвае сістэму каштоўнасных арыентацый і прафесійнага самавызначэння асобы ў сацыяльнай, прававой, палітычнай, гістарычнай і цэхавай прафесійнай прасторы.

---

1. Акмеология // Российская академия государственной службы, 2006. – 424 с.

2. Бягучы архіў кафедры сацыялогіі журналістыкі. Сацыялагічны маніторынг – 2008.